Таким образом, можно констатировать, что право – грандиозный, неисчерпаемый для осознания феномен, имеющий ценностную природу и духовное аксиологическое ядро. Аксиологическое ядро права в рамках этической модели носит нравственно-правовой характер.

***І.Ю. Камко, С.С. Рабава***
*БДЭУ (Мінск)*

## А. АЛІЗАРОЎСКІ – ПРАФЕСАР ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ВІЛЕНСКАЙ АКАДЭМІІ

У 1641 годзе быў створаны і ў 1644 годзе пачаў дзейнічаць у складзе Віленскай езуіцкай акадэміі юрыдычны факультэт. Яго заснавальнікам быў сын славутага Льва Сапегі – Казімір Леў Сапега. Па запрашэнню Казіміра Льва Сапегі ў Вільню прыбылі чатыры прафесары-правазнаўцы сярд якіх быў адзін беларус, ураджэнец Віцебшчыны, прафесар кананічнага права А. Алізароўскі (1610–1659).

Найбольш значнай фігурай сярод выкладчыкаў юрыдычнага факультэта таго часу быў А. Алізароўскі. Сярэднюю адукацыю ен атрымаў у езуіцкіх калегіумах Нясвіжа, Вільні і Полацка, потым удасканальваў веды ў вышэйшых навучальных установах Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Італіі. У 1644 годзе ў Інгольштаце ў мясцовым універсітэце ен атрымаў ступень доктара абодвух праў. Паколькі ўладкавацца на працу ў Інгольштаце яму не ўдалося, А. Алізароўскі паехаў у Італію. Тут яго і застала запрашэнне Л. К. Сапегі на працу ў Вільню ў мясцовы універсітэт. На радзіме А. Алізароўскі ўзначальваў спачатку кафедру кананічнага, а потым цывільнага права.

На радзіме ім была створана галоўная праца жыцця «Аб палітычнай супольнасці людзей». Яна была надрукавана ў 1651 годзе ў Гданьску на лацінскай мове. Кніга складаецца з уводзін і трох частак – «Гаспадарка», «Грамадства», «Дзяржава».

У першай частцы разглядаюцца праблемы шлюбу, сям'і, а таксама адносіны паміж панамі і прыгоннымі. Аналізуючы сямейна-шлюбныя адносіны, А. Алізароўскі закранае пытанні выхавання. Ен выказвае ідэю неабходнасці навучання шляхецкай моладзі рамествам. А. Алізароўскі таксама паказвае выгады, якімі карыстаюцца асобныя еўрапейскія краіны ад росквіту раместваў (у прыватнасці, Англія). У гэтай частцы А. Алізароўскі разглядае таксама становішча сялян у Рэчы Паспалітай, крытыкуе прыгонніцтва, як з'яву, супярэчную натуральнаму праву і шкодную грамадству.

У другой частцы А. Алізароўскі даказвае неабходнасць пашырэння грамадзянскіх праў на ўсіх свабодных жыхароў дзяржавы, у тым ліку і сялян. Пад уплывам гуманістычнай ідэалогіі А. Алізароўскі звязвае паняцце шляхецтва з маральнай дасканаласцю, духоўнай высокароднасцю. Ен праводзіць думку, што сапраўднае шляхецтва складаецца з маральнасці, адукаванасці, ведаў, рацыянальнага ажыццяўлення сваіх правоў і свабод, а таксама сум-

леннага выканання сваіх грамадзянскіх абавязкаў.

У трэцяй частцы аналізаваліся паходжанне і сутнасць дзяржавы, формы дзяржаўнага кіравання. Дзяржаву А. Алізароўскі вызначае як «створанае з паселішчаў аб'яднанне людзей, якія звязаны правам і згодай у імя добрага і шчаслівага жыцця». Разгаядаючы розныя формы дзяржаўнага ўладкавання (манархія, тыранія, арыстакратыя, дэмакратыя), іх станоўчыя і адмоўныя бакі, А. Алізароўскі прыходзіць да высновы, што дасканаласць і моц дзяржавы залежаць ад найбольш рацыянальна выбранай формы дзяржаўнага кіравання. Сам А. Алізароўскі быў прыхільнікам спадчыннай манархіі.

А. Алізароўскі даў таксама класіфікацыю права. Ен выдзяляў: боскае права, натуральнае права і права народаў. Пры гэтым боскае і натуральнае права знаходзяцца не ў падпарадкаванні другога першаму, а выступаюць як самастойныя віды і дапаўняюць адзін аднаго. Ён аналізаваў пераважна натуральнае права, якое прырода закладвае ў чалавеку як сацыяльнай і біялагічнай істоце.

Паводле канцэпцыі Алізароўскага, існуюць тры віды свабоды: прававая, філасофская і палітычная. Прававая свабода – гэта здольнасць людзей у адпаведнасці з прыроднай і агульнай годнасцю распараджацца сваім жыццём паводле ўласнага разумення і патрабаванняў закону. Філасофская – улада розуму надэмоцыямі і імкненнямі. Палітычная – панаванне ў грамадстве права і закону, а несамавольства манарха. Такім чынам, навуковая дзейнасць Алізароўскага стымулявала развіцце прававой культуры ў нашым краі.

*М.А. Клочко, А.В. Ковалевич*
*БГЭУ (Минск)*

# К ВОПРОСУ О ТРУДОВОМ ПРАВЕ В КОНТЕКСТЕ ВЕТХОГО ЗАВЕТА

Трудовое право представляет собой самостоятельную отрасль в системе права Республики Беларусь. Предметом правового регулирования выступают трудовые и связанные с ними общественные отношения, которые урегулированы нормами Трудового кодекса, а также иными нормативными правовыми актами, в том числе и общепризнанными нормами международного права. Трудовое право складывается на основе осуществления трудовой деятельности, как физических, так и юридических лиц, в том числе и индивидуальных предпринимателей. Труд представляет собой целенаправленную деятельность индивидов, при осуществлении которой они затрачивают свои умственные и физические способности, рассчитывая на достижение определенного результата. При этом необходимо вспомнить о том, что труд был основным видом деятельности людей на всех этапах развития общества. Поэтому следует обратиться к такому религиозному источнику как Ветхий Завет, который упорядочивал трудовую жизнь людей с 13 по 1 в. до н.э.

В книге Бытия говорится, что вначале *«не было человека для возделы-*



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.